# УЛАДЗІМЕР ФУРС ЯК МЫСЬЛЯР ПАЛІТЫЧНАГА

**Уладзіслаў Іваноў**

DOI: https://doi.org/10.61095/815-0047-2025-1-132-142

ULADZIMIR FOURS AS A POLITICAL THINKER

© Uładzislaŭ Ivanoŭ
PhD, Associate Professor, Department of Social Sciences, European Humanities University
Savičiaus g. 17, 01127 Vilnius, Lietuva
E- mail: uladzislau.ivanou@ehu.lt
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-1493-0017

*Abstract*: The figure of the philosopher Uladzimir Fours (1963–2009) in the Belarusian intellectual field remains undoubtedly significant, yet insufficiently explored, particularly from an interdisciplinary perspective. His intellectual legacy has not been examined through the lens of political science. The aim of this study is to analyze the texts of this political philosopher from a political science standpoint and to highlight the most valuable aspects of U. Fours's reflections at the intersection of political thought and social theory. To grasp the depth of his political philosophy and emphasize its practical relevance — and at times heuristic potential — for Belarusian political science, it is useful to compare his ideas with those of both his Western and Belarusian contemporaries. Fours's most powerful, insightful, and still timely contribution to the political analysis of Belarusian reality lies in his bold conclusions regarding the Belarusian national project. Equally important is his approach to understanding the phenomenon of Belarusian authoritarianism. By recovering the interdisciplinary and distinctly political dimension of the analytical framework from which he worked, there is ample reason to regard U. Fours as a thinker of the political.

*Keywords*: Uladzimir Fours, social theory, critical political thought, Belarusian national project, Belarusian authoritarianism.

This work is licensed under a Creative Commons Attribution-Noncommercial-No Derivative Works 4.0 International License

## Уступ

Постаць філёзафа Ўладзімера Фурса (1963–2009) у беларускім інтэлектуальным полі да сяньня застаецца адназначна вялікай, але так да канца й не дасьледаванай, не прааналізаванай у міждысцыплінарным вымярэньні. Так, дасюль слаба заяўленыя паліталягічны патэнцыял і палітычная практычная значнасьць інтэлектуальнай спадчыны філёзафа, спэцыяліста ў сацыяльнай тэорыі і, зрэшты, мысьляра палітычнага. Заўчасная сьмерць філёзафа ў свой час не дазволіла выбудаваць паўнавартасны дыялёг з калегамі-палітолягамі. А таму зацікаўленасьць ягонымі напрацоўкамі з боку беларускіх палітолягаў была абмежаванай да нядаўняга часу. Аднак геапалітычныя зварушэньні апошняга дзесяцігодзьдзя ў рэгіёне і асабліва падзеі 2020 году ў Беларусі і тое, што мы назіраем пасьля беларускага прадэмакратычнага выбуху, паўплывалі на вяртаньне і пераасэнсаваньне шматлікіх клясычных арыенціраў, падыходаў у разуменьні сябе і рэгіёну. У такой крытычнай сытуацыі, часта пад знакам дэкаляніялізму і пошукаў унівэрсальных, мажлівых хіба ў межах міждысцыплінарнасьці, падыходаў, распачалася вялікая праца па новым чытаньні тэкстаў, створаных раней, часта ўжо памерлымі мясцовымі аўтар(к)амі. Так, у 2021 годзе менавіта ў такім ключы пры супрацы з Фондам Адэнаўэра быў апублікаваны па-беларуску і па-ангельску зборнік працаў беларускіх палітолягаў і паліталягіняў, якія стаялі ля вытокаў мясцовай палітычнай навукі: «Ля вытокаў беларускай палітычнай навукі» і «At the origins of Belarusian political science» (Іваноў & Сцяпанаў 2021; Ivanoŭ & Sciapanau 2021). Гэта вяртаньне і актуалізацыя спадчыны, якая можа дапамагчы ня толькі надаць уласныя арыенціры незалежнага навуковага мысьленьня, але і лепей зразумець тое, што адбываецца цяпер. У падобным ключы летась адбылося адначасова ўшанаваньне памяці і вяртаньне спадчыны беларускага філёзафа Ўладзімера Фурса. У чэрвені 2024 году ў Вільні ў ЭГУ адбылася міжнародная канфэрэнцыя «Контуры сучаснай крытычнай тэорыі», прысьвечаная У. Фурсу (Канферэнцыя… 2024), а таксама выйшла кніга перакладаў артыкулаў мысьляра на беларускую мову — «Беларусь у сьвятле сучаснай крытычнай сацыяльнай тэорыі» (Фурс 2024). Дарэчы, на канфэрэнцыі адна з панэляў была прысьвечаная палітычнай / паліталягічнай рамцы навуковай спадчыны філёзафа. А ў кнізе перакладаў шмат увагі было нададзена малавядомаму кірунку і пасланьню мысьляра — палітычнай думцы У. Фурса, якая асабліва выразна і актуальна загучала пасьля 2020 году (напрыклад, тлумачэньні немагчымасьці беларускай дэмакратыі, развагі

аб «постсавецкай»[1] рэчаіснасьці ці нязручныя роздумы аб беларускай ідэнтычнасьці). Варта адзначыць, што У. Фурсу, філёзафу і асабліва сацыяльнаму тэарэтыку, ня трэба было сумысьля пазначаць сваю прыналежнасьць да паліталягічнай дысцыпліны, бо сама крытычная сацыяльная тэорыя ахоплівае міждысцыплінарнае, у тым ліку паліталягічнае, поле. Згодна з гэтай лёгікай, хоць ён і быў перадусім філёзафам, знаўцам крытычнай сацыяльнай тэорыі, ён быў у тым ліку і палітычным мысьляром. Аднак часта досыць абмежаваная дысцыплінарна клясычная паліталёгія ня лічыць іншадысцыплінарных дасьледнікаў сваімі калегамі.

Тым ня менш у тэксьце прапануецца аналіз тэкстаў філёзафа з пазыцыі палітычнай і паліталягічнай, што адкрывае нам ня проста новае вымярэньне інтэлектуальнай дзейнасьці мысьляра, але перадусім падкрэслівае ягоную празорлівасьць, крытычнасьць і ўсё яшчэ актуальнасьць многіх ягоных развагаў.

## Сацыяльная тэорыя: ад філязофіі да палітыкі

Прафэсійны філёзаф, У. Фурс на пачатку XXI ст. абараніў доктарскую дысэртацыю на тэму «Крытычная сацыяльная тэорыя ў заходняй філязофіі 70–90-х гг. XX ст.: тыпалягічная рэканструкцыя», але яшчэ раней, у канцы XX ст., пачаў удзельнічаць у міждысцыплінарных праектах і праграмах. Адным з цэнтральных такіх праектаў стаўся якраз праект «Контуры сучаснай крытычнай тэорыі» ў Нямеччыне. Мысьляр па хуткім часе заняў моцную пазыцыю ў беларускім інтэлектуальным полі як адзін зь першых і нямногіх у беларускай акадэміі знаўцаў сучаснай крытычнай тэорыі. Гісторыя бібліяграфіі мысьляра адлюстроўвае на сутыку XX–XXI стст. моцны паварот да сацыяльнай тэорыі і палітычнай думкі. У. Фурс актыўна апэруе асноўнымі імёнамі заходняй сацыяльнай тэорыі, абавязкова прыкладаючы іх да беларускай і рэгіянальнай рэчаіснасьці. Беларускі кантэкст і «постсавецкая рэчаіснасьць» становяцца абавязковай умовай рэфлексіі мысьляра: гэтага практычнага ўжытку тэорыі ён будзе прытрымлівацца да канца. Такім парадкам, філёзаф У. Фурс заўсёды засяроджваўся на палітычных фэномэнах, якія разглядаў у сацыялягічных і філязофскіх

1 Панятак «постсавецкі» апошнія гады не ўжываецца ў заходнім, у тым ліку крытычным беларускім, сьвеце, бо лічыцца каляніялісцкім. У той час, калі працаваў У. Фурс, панятак яшчэ ўжываўся і ня меў нэгатыўнай і састарэлай канатацыі. Хаця варта пазначыць, што мысьляр крытычна аналізаваў дадзены панятак ужо ў 2005 годзе (Фурс 2012: 396).

вымярэньнях, ставячы ў цэнтар аналіз сацыяльных і палітычных канфліктаў. Пры гэтым ён падкрэсьліваў актуальнасьць, то бок важнасьць сацыяльнай тэорыі праз прызму аўтарытарызм / дэмакратыя. І з той прычыны, што ён беларус, то бок практычны знаўца аўтарытарызму, ягоны аналіз часта ўдаваўся больш пераканаўчым, чым заходнія тэорыі, распрацаваныя ва ўмовах дэмакратыі.

Перад тым, як перайсьці да канкрэтнай спадчыны У. Фурса, распрацаванай на мяжы сацыяльнай тэорыі і палітычнай думкі, варта коратка азначыць гэтыя паняткі і іхную сувязь. Варта разумець, што сынтагма «сацыяльная тэорыя і палітычная думка» азначае безупыннае абвяржэньне ідэі пабудовы гарманічнага грамадзтва. З аднаго боку, «сацыяльная тэорыя» адрозьніваецца ад цяперашняй «сацыяльнай філязофіі», засяроджанай на формах прызнаньня, справядлівасьці і «клопату», і імкнецца трымаць палітычнае пытаньне адкрытым. А зь іншага боку, «(крытычная) палітычная думка», на якую пастаянна абапіраўся У. Фурс, чэрпае зь першай і другой Франкфурцкай школы, азначае рэфлексіўную, недактрынальную і прагматычную працу, заклапочаную дэканструкцыяй любых формаў панаваньня і вызначэньнем сілаў эмансыпацыі, якія існуюць у грамадзтве (Фурс 2002). Якраз у гэтым разрэзе варта разумець тэксты У. Фурса.

Так, Французская лябараторыя сацыяльных і палітычных зьмяненьняў пры Парыскім унівэрсытэце (LCSP, Laboratoire du Changement Social et Politique) вылучае пяць асноўных кірункаў у межах сацыяльнай тэорыі і крытычнай палітычнай думкі:

1. Касмапалітычная праблематыка.
2. Дэмакратыя, гвалт і грамадзянства.
3. Апытаньні па сацыяльных пытаньнях.
4. Суб’екты і суб’ектывацыі.
5. Каляніяльнасьць і дэкаляніяльнасьць (LCSP).

Дадзеныя кірункі якраз досыць поўна ахопліваюць палітычную думку У. Фурса. У сваю чаргу, беларускі мысьляр абапіраўся на працы Макса Горкгаймэра ў стварэньні асноўных складнікаў крытычнай тэорыі (Фурс 2001: 92). Адным з такіх складнікаў якраз зьяўляецца палітычная кампанэнта крытычнай тэорыі, бо «сама зьяўляецца формай палітычнай практыкі» (Фурс 2001: 93).

## Палітычная думка Ўладзімера Фурса

Касмапалітычная праблематыка, а разам зь ёю тэма каляніяльнасьці і дэкаляніяльнасьці займаюць важнае месца ў развагах мысьляра. Якраз дадзеныя праблематыкі У. Фурс канкрэтызуе на прыкладзе пытаньня беларускай тоеснасьці ў рэгіянальным і глябальным вымярэньні: «Глобализация жизненного мира в свете

социальной теории: к постановке вопроса» (Фурс 2000), «Беларуская “реальность” в системе координат глобализации (постановка вопроса)» (Фурс 2005), «Белорусский проект “современности”?» (Фурс 2007), «К вопросу о “белорусской идентичности”» (Фурс 2018). Па-беларуску апошні тэкст быў апублікаваны пад іншай назвай — «Структурныя прынцыпы альтэрнатыўнага нацыятварэньня» (Фурс 2008a).

Больш паліталягічныя пытаньні, зьвязаныя з тэмай дэмакратыі, недэмакратыі і грамадзянства, дасьледнік разглядае ў сваіх наступных працах: «“Феминистски-социалистическая” критическая теория позднего капитализма Н. Фрэйзер» (Фурс 2004), «“Власть народа”: современные представления о демократии и белорусская модель “народовластия”» (Фурс 2006), «Ресоветизация белорусских университетов» (Фурс & Дунаев 2007), «Трансформация публичности и постсоветская ситуация» (Фурс 2008b), «(Re)thinking the “public sphere” with Arendt and Habermas» (Фурс 2008c).

З пазыцыі адначасова міждысцыплінарнай і паліталягічнай найбольш каштоўнымі рэфлексіямі Ўладзімера Фурса зьяўляюцца наступныя:

1. Крытычны аналіз розных нацыянальных праектаў у беларускім кантэксьце. Мысьляр аналізуе асноўныя нацыянальныя праекты — як канструктывісцкага, так і эсэнсэалісцкага, то бок этнанацыянальнага, кшталту. З аднаго боку, у Беларусі існуе афіцыйны нацыянальны праект — «праект шчасьця», магчымы ня толькі таму, што навязаны аўтарытарным рэжымам, але і таму, на думку У. Фурса, што ён падаецца і малюецца пазытыўна (Фурс 2008). У гэтым праекце беларусы трактуюцца як дзеці ці псыхічнахворыя асобы. А зь іншага боку, існуе беларускі этнанацыянальны праект, які У. Фурс досыць слушна крытыкуе за элітызм, эксклюзіўнасьць (Фурс 2008: 89). Пры гэтым дасьледнік ідзе далей — выходзіць з дыхатамічнай візіі нацыяналізму і прапануе «альтэрнатыўнае нацыятварэньне» (Фурс 2008) шляхам улічваньня розных пазыцыяў і падыходаў, бо важнай умовай разьвіцьця беларускага праекту сучаснасьці зьяўляецца артыкуляцыя супольнага сацыяльнага «ўяўленага» (Фурс 2008). Гэты альтэрнатыўны падыход у распрацоўцы новага нацыянальнага праекту часта ігнаруюць палітолягі, застаючыся ў межах дыхатаміі грамадзянскага (канструктывісцкага) і этнічнага (эсэнсэалісцкага) нацыяналізму. А вось філёзафы і гісторыкі яшчэ раней заўважылі гэтую цікавую і сьмелую выснову (Щитцова 2020) ці «парадокс Фурса» (Лявіцкі 2017).

2. Крытычная адаптацыя да беларускага кантэксту заходніх канцэптаў, у прыватнасьці, «публічнай сфэры» К. Кастарыядыса (Фурс 2006). У. Фурс адным зь першых у беларускай навуковай прасторы патлумачыў прынцыповае адрозьненьне паміж публічным і прыватным у дэмакратыі і недэмакратыі (дзякуючы

канцэпту «публічнай сфэры» Кастарыядыса). Ён прадэманстраваў адрозьненьне ня толькі на роўні тэрмінаў («публічная сфэра» ў дэмакратыі і «публічнасьць» ва ўмовах аўтарытарызму; такім парадкам, публічнай сфэры ў недэмакратыі не існуе — толькі пэўная публічнасьць), але і на зьмястоўным роўні (у дэмакратыі існуе рэальная аўтаномія прыватнага, у дадатак у дэмакратыі ў наяўнасьці прамежкавы стан паміж публічным і прыватным — г. зв. «праект аўтаноміі»).

3. Вызначэньне паняткаў «дэмакратыя» і «недэмакратыя» з дапамогай архаічнага азначэньня «народаўладзьдзе» і зноў жа канцэптаў К. Кастарыядыса (Фурс 2005, 2006). У. Фурс вельмі дакладна, кропкава, а таму часам і больш даступна за калегаў-палітолягаў давёў, чаму Беларусь не дэмакратыя: дзякуючы Кастарыядысавым паняткам «аўтаномія», «прынцып аўтаноміі палітычнай супольнасьці», якія фармуе калектыўную самадзейнасьць і роўнасьць палітычных гульцоў у дэмакратыі (Фурс 2006: 15). Мы назіраем шмат гадоў, што ў Беларусі дадзены прынцып не працуе: празрыстасьці і рэфлексіўнасьці ўлада не дэманструе, навідавоку хіба вэртыкаль рэжыму, кантроль палітычнага поля, а таксама запалохваньне і гвалт палітычных гульцоў, што руйнуе любую спробу мінімальнай аўтаноміі. Таксама цікавы і важны паняткавы ровень «народаўладзьдзя»: на сучасным этапе хіба аўтарытарныя краіны зьвяртаюцца да падобнага архаічнага этымалягічнага азначэньня, якое на Захадзе здаўна не сустракаецца.

4. Зрэшты, трэба коратка спыніцца на тэксьце «“Феминистски-социалистическая” критическая теория позднего капитализма Н. Фрэйзер» (Фурс 2004): тут вартае ўвагі ня проста апісаньне «постсацыялісцкай палітычнай імажынэрыі» ці «постсацыялісцкага стану» (Фурс 2004), а перадусім разуменьне прычынаў зацягласьці дэмакратычнага транзыту, важнасьці фэміністкай крытыкі існых дэмакратычных сыстэмаў і актуальнасьці публічнай фэміністкай позвы дня. Да ўсяго мысьляр усьлед за Н. Фрэйзэр закранае тэму маргіналізацыі ў постсацыялісцкім стане ня толькі кабетаў, але «гомасэксуальных статусных групаў» (Фурс 2004: 95–96). Гэты невялікі аналіз тым ня менш ёсьць надзвычай сьмелым і карысным у разуменьні стэрэатыпаў і страхаў, якія дамінуюць у недэмакратыі ў дачыненьні да гендарнай і ЛГБТК+ тэмы і гендарнай позвы наагул. Дарэчы, многія сучасныя беларускія мысьляры дасюль асьцярожнічаюць з тэмай ЛГБТК+, пазьбягаюць сумысьля выкарыстоўваць прыклады, зьвязаныя з гэтай тэмай, ці працаваць з тэмай маргіналізацыі на прыкладах гей і/ці лесьбі-супольнасьцяў. У. Фурс ня быў дасьледнікам ЛГБТК+супольнасьці, аднак стаў адным зь першых беларускіх мысьляроў, хто выразна і поўна ў апісаньні постсацыялісцкага стану ўлічыў нароўні з маргіналізацыяй кабетаў нябачнасьць геяў.

Такім парадкам, каштоўныя напрацоўкі філёзафа і мысьляра палітычнага выкарыстоўваюцца міждысцыплінарна, ці, як казаў сам аўтар, «трансдысцыплінарна» (Фурс 2002, 2012), у тым ліку ў паліталёгіі. Крытычная рэакцыя палітолягаў на выступы і тэксты У. Фурса часткова апраўданая і пры гэтым дэманструе пэўны дыялёг паміж навукоўцамі адначасова розных і супольных тэарэтычных і дасьледчых палёў (Казакевіч 2005). Філязофская і палітычная думка У. Фурса — багатая, разнастайная, «унівэрсальная і агульназначная», па словах філёзафкі В. Шпарагі (Шпарага 2012: 16). Аднак кожная мадэль мае пэўныя слабыя зьвёны: так, не зважаючы на крытычнасьць у аналізе беларускай і наагул постсацыялісцкай палітычнай сытуацыі, мысьляр часам перабольшвае з унівэрсалісцкім падыходам, трапляючы ў пастку каляніялізму. У сваёй рэцэнзіі «“Арыенталізм”, альбо некалькі заўваг пра “казус Беларусь”» палітоляг А. Казакевіч зрэагаваў на чатыры публікацыі ў часопісе «Topos» 2005 году (Фурс 2005; Щитцова 2005; Горных 2005; Пикулик 2005) і зьвярнуў увагу на хібы ўнівэрсальных схемаў думаньня і аналізу, «пазбаўленых кантэксту», да якіх часта зьвяртаюцца беларускія інтэлектуалы ЭГУ (Казакевіч 2005). А. Казакевіча асабліва зьдзівілі перакруты ўнівэрсалізму і стэрэатыпізацыі беларускасьці ў тэкстах выкладнікаў ЭГУ, у меншай ступені У. Фурса (Казакевіч 2005). Іншы дасьледнік, філёзаф А. Анціпенка яшчэ больш крытычна зрэагаваў на тую ж самую публікацыю У. Фурса (Фурс 2005), падкрэсьліўшы каляніялісцкую лёгіку думаньня мысьляра і ягоную належнасьць да іншай культурнай прасторы (Анціпенка 2012: 50–52).

У межах дэкаляніялісцкага падыходу варта дапоўніць крытыку: хоць трэба прызнаць аналіз беларускага нацыянальнага праекту Ў. Фурса сьмелым і цікавым, мысьляр усё ж, падаецца, не прысьвяціў належнай увагі тэме беларускамоўнасьці і маштабу праблемы русіфікацыі ды беларусафобіі, зь якой сутыкнулася беларуская культура ў апошнія дзесяцігодзьдзі і стагодзьдзі. Якраз гэты момант абумовіў крытыку А. Анціпенкі, які аднёс У. Фурса да «іншай культурнай прасторы» (Анціпенка 2012: 50–52). Згода, што беларускамоўны праект — элітысцкі і эксклюзіўны, але варта ня проста канстатаваць, а разумець і тлумачыць прычыны гэтай зьявы і наагул зьявы маргінальнасьці беларускамоўных. Вядома, з пазыцыі ўнівэрсалізму ды расейскамоўнасьці і расейскадумнасьці любы партыкулярызм будзе трактавацца як эксклюзіўны. Якраз (ня)веданьне і (не)адчуваньне кантэксту ўваходзіць у канфлікт зь філязофскім унівэрсалізмам.

Збольшага У. Фурс па-філязофску, то бок досыць карэктна і ўнівэрсальна выказваецца, калі аналізуе беларускае нацыятварэньне наагул і розныя ягоныя праекты (ад этнанацыяналізму да расейскамоўнага беларускага нацыяналізму і завяршаючы

грамадзянскім нацыяналізмам) (Фурс 2008a). Аднак аўтар крыху па-папулісцку ці не зусім акуратна выкарыстоўвае выраз «прапаганда беларускай мовы» ў сваёй крытыцы мадэлі этнанацыяналізму (Фурс 2008a: 89). І тут можна пабачыць пэўныя паралелі з дыскурсам афіцыйнага менскага рэжыму, які безупынку палохае грамадзтва прапагандай беларускай мовы, якую аўтаматычна зьвязвае зь дзейнасьцю апазыцыі ці, паводле азначэньня А. Лукашэнкі, з «бэчэбэшнымі вар'ятамі» (Лукашэнка 2022). Так, мова — важны, калі ня першы элемэнт этнанацыяналізму, але ў беларускім кантэксьце варта быць вельмі асьцярожным у абагульненьнях наконт мовы і ейнай прапаганды: сярод беларускай апазыцыі зусім мала сілаў, рухаў, якія прапагандавалі беларускую мову. У мінулым хіба БНФ актыўна і прынцыпова выступаў і прапагандаваў беларускую мову, большасьць сілаў апазыцыі выступалі ў падтрымку беларускай мовы і зусім не адмаўляліся ад расейскай. Таму рэжымны страх перад прапагандай беларускай мовы часткова распаўсюдзіўся і сярод прадэмакратычных расейскамоўных беларусаў. У гэтым ключы можна ўспрыняць заўвагу У. Фурса. Зрэшты, і пасьля 2020 году беларускамоўны праект ня стаў унівэрсальным: не зважаючы на эўфарыю і выбух інтарэсу да беларускай мовы ў выніку рэвалюцыі годнасьці, беларускамоўны праект застаецца элітысцкім, моцна сымбалічным і досыць абмежаваным у колькасным пляне (як у самой Беларусі, так і ў замежжы ці выгнаньні) (Нагорная 2023). Не беларуская мова, не этнанацыянальны праект запрацавалі ў 2020 годзе і пазьней, а якраз тое, аб чым пісаў У. Фурс, — хаўрус усіх сілаў разам, «альянс (найперш беларускага этнанацыяналізму, расейскамоўнага беларускага нацыяналізму, "эўраінтэгратараў" і "касмапалітычных лібэралаў")» (Фурс 2008a: 90).

Таксама неабходна прыгадаць некарэктнае і каляніялісцкае абагульненьне У. Фурса, калі ў артыкуле «Контуры сучаснай крытычнай тэорыі» ён ужыў азначэньне «расейская філязофія», падразумяваючы пад ім усю «постсавецкую расейскамоўную інтэлектуальную прастору» (Фурс 2012: 8). Беларускія падзеі 2020 году і вайна ва Ўкраіне давялі немагчымасьць і нават небясьпечнасьць падобнага абагульненьня — цяпер ужываньне паняткаў кшталту «постсавецкі», «расейскамоўны» і падобных вымагае пільнасьці, скрайняй карэктнасьці, а часам, магчыма, перагляду і адмовы ад некаторых зь іх. Зрэшты, вайна ва Ўкраіне прадэманстравала, да чаго вядзе нібыта расейскі і расейскамоўны ўнівэрсалізм, а таму ў аналізе сучаснай украінскай сытуацыі можа быць карыснай мадэль «альтэрнатыўнага нацыятварэньня», ужытая У. Фурсам у дачыненьні да разьвіцьця сучаснага беларускага нацыяналізму і нацыятварэньня (Фурс 2008). Такая ж мадэль — шляхам улічваньня розных пазыцыяў і падыходаў, а галоўнае — з акцэнтам на

артыкуляцыі супольнага сацыяльнага «ўяўленага», нават ва ўмовах вайны, назіраецца ва Ўкраіне.

## Заканчэньне

На сутыку сацыяльнай тэорыі і палітычнай думкі паўстаў альтэрнатыўны пэрспэктыўны падыход у сацыяльных навуках, у тым ліку ў беларускім кантэксьце. У. Фурс стаўся адным зь першых беларускіх мысьляроў гэтай тэндэнцыі, які не застаўся ў межах аднолй дысцыпліны — у ягоным выпадку філязофіі, — а крочыў у міждысцыплінарнае поле, сьмела закрануўшы палітычную навуку, палітычную філязофію, сацыяльную тэорыю, стварыўшы, такім чынам, істотна новы, крытычны погляд на фэномэн палітычнага (і што важна — палітычнага ва ўмовах беларускай недэмакратыі). У. Фурс ня толькі філёзаф, але і мысьляр палітычнага, які стаў нароўні з калегамі-палітолягамі (У. Роўдам, В. Чарновым, І. Бугровай, В. Карбалевічам, С. Панькоўскім ды некаторымі іншымі) у 90-я гады мінулага стагодзьдзя адным зь першых у Беларусі тэарэтыкаў і адаптатараў многіх заходніх канцэптаў для разуменьня і рэфармаваньня беларускай рэальнасьці. Разам з узгаданымі палітолягамі У. Фурс спрычыніўся да інтрадукцыі і знаёмства як беларускай акадэміі ў стане постсацыялісцкай трансфармацыі, так і грамадзтва наагул з сучаснай крытычнай сацыяльнай тэорыяй.

Дзякуючы філязофскаму досьведу, адукацыі, а таксама міждысцыплінарнай прызьме, уласьцівай крытычнай сацыяльнай тэорыі, У. Фурс часам сьмялей і дАступней за калегаў-палітолягаў прааналізаваў пэўныя важныя палітычныя / паліталягічныя тэмы: публічная сфэра ў дэмакратыі, публічнасьць ва ўмовах аўтарытарызму, дэмакратыя-«народаўладзьдзе», недэмакратыя, беларуская ідэнтычнасьць, нацыянальны праект і пад. Ён прапанаваў каштоўныя і дасюль карысныя высновы-напрацоўкі ў пытаньні вызначэньня недэмакратычнасьці Беларусі, у тлумачэньні ўстойлівасьці беларускага аўтарытарызму. Асобнае месца ў ягонай інтэлектуальнай думцы належыць рэфлексіі на тэму беларускага нацыянальнага праекту: так, канструктыўны трансдысцыплінарны альтэрнатыўны погляд мысьляра на спалучэньне элемэнтаў як грамадзянскага, так і этнанацыяналізму ў беларускай нацыятворчай мадэлі будучыні заслугоўвае ўвагі, за што атрымаў назоў «парадокс Фурса» (Лявіцкі 2017). Не зважаючы на пэўную крытыку з боку некаторых дасьледнікаў — палітоляга А. Казакевіча (Казакевіч 2005) і філёзафа А. Анціпенкі (Анціпенка 2012: 50–52), палітычная думка У. Фурса застаецца актуальнай, крытычнай, лібэральнай і праэўрапейскай. А галоўнае — нарэшце ягоная спадчына перакладаецца на беларускую, аналізуецца ня толькі філёзафамі,

уводзіцца ў актыўны палітычны аналіз, што дазваляе назваць заўчасна памерлага праэўрапейскага філёзафа да ўсяго мысьляром палітычнага.

## References


Antsipyenka, A. (2012). *Byts' (pry)sutnym.* Vil'nya: Byelaruski kalyehiyum. — In Bel.

[Анціпенка, А. (2012). *Быць (пры)сутным.* Вільня: Беларускі калегіюм.]

Gornyh, A. (2005). Belarus': sluchaj antimodernoj ideologii. *Topos* 1 (10): 29–34. — In Rus.

[Горных, А. (2005). Беларусь: случай антимодерной идеологии.]

Ivanou, U., Stsyapanau, A. (2021). *Lya vytokaw byelaruskay palitychnay navuki.* Vil'nya: Konrad Adenauer Stiftung Belarus. — In Bel.

[Іваноў, У., Сцяпанаў, А. (2021). *Ля вытокаў беларускай палітычнай навукі.* Вільня: Konrad Adenauer Stiftung Belarus.]

Ivanou, U., Stsiapanau A. (2021). *At the Origins of Belarusian Political Science.* Vilnius: Konrad Adenauer Stiftung Belarus.

Kazakyevich, A. (2005). «Aryyentalizm», al'bo nyekal'ki zawvah pra «kazus Byelarus'». *ARCHE* 6. https://xn--d1ag.xn--e1a4c/pub/arche/html/2005-6/kazakievic605.htm (accessed: 20.01.2025). — In Bel.

[Казакевіч, А. (2005). «Арыенталізм», альбо некалькі заўваг пра «казус Беларусь». *ARCHE* 6.]

Kanfyerentsyya «Kontury suchasnay krytychnay teoryi», prysvyechanaya pamyatsi byelaruskaha filosafa Uladzimira Foursa, proydzye w EHU. *Reform.news* 31.03.2024. https://reform.news/... (accessed: 20.01.2025). — In Bel.

[Канферэнцыя «Контуры сучаснай крытычнай тэорыі», прысвечаная памяці беларускага філосафа Уладзіміра Фурса, пройдзе ў ЕГУ.]

LCSP Laboratoire du Changement Social et Politique. https://lcsp.u-paris.fr/axes-de-recherche/theorie-sociale-et-pensee-politique/ (accessed: 20.01.2025).

Lukašenka, A. (2022). Blagodara etim bezumcam bcb-snym my, kak govorat, vyplesnuli i rebenka «belaruskuu movu». ONT 25.01.2022. https://www.youtube.com/... (accessed: 20.05.2025). — In Rus.

[Лукашенко, А. (2022). Благодаря этим безумцам бчб-шным мы, как говорят, выплеснули и ребенка «беларускую мову». ОНТ.]

Lyavitski, A. (2017). Chamu «svyadomaya historyya» maye buduchynyu. *Nasha Niva* 11.10.2017. https://nashaniva.com/198758. (accessed: 20.01.2025). — In Bel.

[Лявіцкі, А. (2017). Чаму «свядомая гісторыя» мае будучыню. *Наша Ніва.*]

Nahornaja, A. (2023). Dastupnasc' i dyskryminacyja bielaruskaj movy u Bielarusi. https://belinstitute.com/... (accessed: 20.05.2025). — In Bel.

[Нагорная, А. (2023). Даступнасць і дыскрымінацыя беларускай мовы ў Беларусі.]

Pikulik, A. (2005). Matritsa, paternalizm i sem'ya-strana. Antropologiya belorusskoy ideologii. *Topos* 1 (10): 35–39. — In Rus.

[Пикулик, А. (2005). Матрица, патернализм и семья-страна. Антропология белорусской идеологии.]

Fours, V. (2000). Globalizatsiya zhiznennogo mira v svete sosial'noy teorii. *Obshchestvennyye nauki i sovremennost'* 6: 128–139. — In Rus.
[Фурс, В. (2000). Глобализация жизненного мира в свете социальной теории...]
Fours, V. (2001). Kontury sovremennoy kriticheskoy teorii. *Topos* 1 (4): 92–95. — In Rus.
[Фурс, В. (2001). Контуры современной критической теории.]
Fours, V. (2004). «Feministski-sotsialisticheskaya» kriticheskaya teoriya pozdnego kapitalizma N. Freyzer. *Polis* 6: 89–101. — In Rus.
[Фурс, В. (2004). «Феминистски-социалистическая» критическая теория позднего капитализма Н. Фрэйзер.]
Fours, V. (2005). Belaruskaya «real'nost'» v svete koordinat globalizatsii. *Topos* 10: 5–18. — In Rus.
[Фурс, В. (2005). Беларуская «реальность» в системе координат глобализации.]
Fours, V. (2006). «Vlast' naroda»: sovremennye predstavleniya o demokratii. *Topos* 13: 15–24. — In Rus.
[Фурс, В. (2006). «Власть народа»: современные представления о демократии...]
Fours, V., Dunayev, V. (2007). Resovetizatsiya belorusskikh universitetov. In: *Vyssheye obrazovaniye v Belarusi*. Vil'nyus: EGU. — In Rus.
[Фурс, В., Дунаев, В. (2007). Ресоветизация белорусских университетов.]
Fours, U. (2008a). Strukturnyya pryntsypy al'ternatywnaha natsyyatvaren'nya. *ARCHE* 11: 85–90. — In Bel.
[Фурс, У. (2008a). Структурныя прынцыпы альтэрнатыўнага нацыятварэння.]
Fours, V. (2008b). Vvedeniye: Transformatsii publichnosti. In: *Postsovetskaya publichnost'*. Vil'nyus: EGU. — In Rus.
[Фурс, В. (2008b). Введение: Трансформации публичности и постсоветская ситуация.]
Fours, U. (2008c). (Re)thinking the «public sphere» with Arendt and Habermas. *Topos* 2 (19): 94–100.
Fours, V. (2012). Kontury sovremennoy kriticheskoy teorii. In: *Sochineniya. Tom* 2. Vil'nyus: EGU. — In Rus.
[Фурс, В. (2012). Контуры современной критической теории.]
Fours, U. (2018). K voprosu o «belorusskoy identichnosti». In: *Sochineniya. Tom* 1. Vil'nyus: EGU. — In Rus.
[Фурс, У. (2018). К вопросу о «белорусской идентичности».]
Fours, U. (2024). *Byelarus' u svyatlye suchasnay krytychnay teoryi*. Ed. V. Furs, A. Ralyonka. Vil'nya: Lohvinaw. — In Bel.
[Фурс, У. (2024). *Беларусь у святле сучаснай крытычнай тэорыі.*]
Shparaga, O. (2012). Predisloviye. In: *Fours*, V. *Sochineniya. Tom* 1. Vil'nyus: EGU. — In Rus.
[Шпарага, О. (2012). Предисловие.]
Shchyttsova, T. (2005). Pod patronazhem: avtoritarnyi rezhim v svete kulturnoi antopologii. *Topos* 1 (10): 19–28. — In Rus.
[Щитцова, Т. (2005). Под патронажем: авторитарный режим в свете культурной антропологии.]
Shchyttsova, T. (2020). In Memoriam. Vladimir Fours. *Topos* 2: 7–10. — In Rus.
[Щитцова, Т. (2020). In Memoriam. Владимир Фурс.]